ДА 500-ГОДДЗЯ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ



# Побач са Скарынам

**Незвычайная выстава адкрылася ў Полацкім дзяржаўным універсітэце. На ёй прадстаўлены работы, дасланыя на фотаконкурс «Сфатаграфуйся са Скарынам», арганізаваны ў гонар 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.**

Ідэя конкурсу належала супрацоўнікам навуковай бібліятэкі ПДУ. У сацыяльных сетках і на сайце ўніверсітэта яны распаўсюдзілі інфармацыю, дзе запрасілі ўсіх жадаючых дасылаць фотаздымкі, зробленыя на фоне выяў знакамітага асветніка-гуманіста Францыска Скарыны. Вынік прыемна парадаваў.

– Мы нават не чакалі такой зацікаўленасці, – падзялілася ўражаннямі **загадчыца аддзела навуковай бібліятэкі Ірына Шупенька**. – На заклік адгукнуліся не толькі студэнты і супрацоўнікі нашага ўніверсітэта, але і іншыя людзі. На конкурс былі дасланы здымкі, зробленыя каля помнікаў Скарыне ў Полацку, Мінску, Лідзе і нават Празе. Аўтары творча падышлі да задання, прыдумаўшы сваім працам арыгінальныя назвы, дзе адлюстравалі сутнасць зробленага Скарынам.

Экспазіцыю, створаную па выніках конкурсу, можна пабачыць у выставачнай зале навуковай бібліятэкі да канца верасня. На яе адкрыцці аўтары лепшых фотаздымкаў былі ўзнагароджаны памятнымі прызамі і дыпломамі.

Так, першае месца заваявала палачанка Таццяна Калінцава, якая перадала сімвалічную сувязь стагоддзяў, сфатаграфаваўшы на фоне помніка першадрукару свайго сына Арцёма. Прыз глядацкіх сімпатый атрымаў Пётр Лапо, а Гран-пры ўганаравана праца маладой выкладчыцы ПДУ Ірыны Фруцкай пад назвай «Жыве ў вяках агонь беларускага Праметэя» **(на фота)**.

**Ларыса МАЛАШЭНЯ. Фота з архіва навуковай бібліятэкі ПДУ.**